# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

5 студзеня 2018 г. № 1 (433)




стар. 3

**На што пойдуць грошы?**



стар. 5

**З бетоншчыка — у кухары**



стар. 8

**Усё пачалося... з агуркоў**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ПРАЦА ЗНОЙДЗЕЦЦА ЎСІМ?

## Якім будзе абноўлены дэкрэт № 3

**1 студзеня 2019 года запрацуе абноўлены дэкрэт № 3. Дакумент, які нарабіў шмат шуму, зменіць і сваю назву (рабочы варыянт — «Па садзейнічанні занятасці»), і сутнасць. Якой жа будзе новая рэдакцыя, што чакае беспрацоўных і якія меры плануюць прымяняць да тых, хто не збіраецца шукаць работу?**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### *Ад збору з утрыманцаў да камісій па працаўладкаванні*

Дэкрэт «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» быў прыняты 2 красавіка 2015 года. Ён павінен быў стымуляваць беларусаў да працоўнай дзейнасці і забяспечыць удзел усіх у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў. Тыя, хто сядзеў без работы больш за 183 дні ў годзе, мусілі плаціць адмысловы збор.

У пералік тых, хто вызваляецца ад такога падатку, трапілі пенсіянеры, людзі з інваліднасцю, грамадзяне, якія паўгода правялі па-за межамі Беларусі, маці, якія выхоўваюць дзіця ва ўзросце да сямі гадоў. Не павінны былі плаціць збор таксама рамеснікі, рэпетытары, сельскія жыхары, якія вядуць падсобныя гаспадаркі, і іншыя. У спісе вызваленых ад падатку аказаліся і беларусы, афіцыйна зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных: гэта стала адной з прычын, чаму службы занятасці наваднілiся ахвотнымі стаць на біржу.

Утрыманцы, якія выплочвалі падатак добраахвотна, маглі атрымаць зніжку: таму, хто па сваёй ініцыятыве аплачваў збор да канца мая 2016 года, памяншалі яго на 10 працэнтаў. У пачатку 2017 года, пасля маніторынгу зваротаў грамадзян, у дэкрэт унеслі некалькі змяненняў. Да перыяду ўдзелу ў фінансаванні дзяржвыдаткаў аднеслі, напрыклад, праходжанне альтэрнатыўнай службы, знаходжанне ў нацыянальнай ці зборнай камандзе краіны па розных відах спорту.

стар. 4

СПРЫЯЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ

# АЎТАМАБІЛЯМ ТУТ НЕ МЕСЦА

## У Магілёве рэалізуецца праект «дамоў будучага», які пазбавіць жыхароў ад выхлапных газаў каля пад'езда

**Апошнім часам гарадскія двары ўсё часцей нагадваюць бясплатныя стаянкі для машын. Аўто стаяць нават там, дзе па законе іх быць не павінна — ледзь не каля ўваходных дзвярэй. Пілотны праект, які рэалізуецца ў Магілёве, кардынальна мяняе гэта становішча. Паводле яго, агульныя на некалькі дамоў двары стануць выключна зонай адпачынку для дзяцей і дарослых. А вось аўтамабілі прыйдзецца пакідаць па-за дваровай тэрыторыяй — там, дзе для гэтага прадугледжана спецыяльная пляцоўка.**

### АРЭЛІ, ГОРКІ, СТОЛІКІ...

Адзін з чатырох дамоў па вуліцы Касманаўтаў, пабудаваны па новым праекце, ужо цалкам гатовы. Ён яшчэ не заселены, але сям-там вокны ўжо свецяцца — людзі робяць рамонты. Двор тут кардынальна непадобны на іншыя. Большую частку яго плошчы займае абсталяванне для зусім маленькіх дзяцей, побач зона для больш дарослых, дзе ёсць нават сталы для тэніса. Збоку невялікае поле для рухавых гульняў са спецыяльным пакрыццём. Гэта — гумавая плітка, якая, дарэчы, вырабляецца на тэрыторыі Магілёўшчыны. Сімпатычныя рознакаляровыя квадрацікі не толькі выглядаюць прывабна, але і па адчуваннях, калі ідзеш па іх, нагадваюць дыван. На такім пакрыцці калені не разаб'еш дакладна. Гумавай пліткай вымашчана ўся дваровая тэрыторыя, што робіць прагулку яшчэ больш прыемнай. Дастаткова тут і лавачак для адпачынку, пасаджаны кусты і дрэвы. Злева ад будынка спецыяльная пляцоўка з трыма паўсферычнымі ёмістасцямі — тымі самымі заглыбленымі кантэйнерамі, якія цяпер актыўна ўстанаўліваюць камунальнікі па ўсім Магілёве. Пад'езд для аўто да дома ёсць, але скразны — заехаў з аднаго боку, зрабіў круг вакол зоны адпачынку і выехаў. Надоўга тут не прыпаркуешся — для гэтага зроблена спецыяльная пляцоўка на некаторай адлегласці ад шматпавярховіка.

стар. 7



А стаянка для машын — асобна.